**Заключэнне.** Такім чынам, стратэгіі Міхала разнастайныя адносна камунікатыўнай мэты і, адпаведна, моўнага выражэння. Выказванні насычаны дзеясловамі, якія як ключавыя адзінкі фарміруюць маўленне, змяняюць адценні размовы, дакладна перадаюць пачуцці героя – сумненні, радасць, гора і інш. Маўленчыя стратэгіі просьбы, загаду выражаюццая як непасрэдна, так і ўскосна, што характарызуе галоўнага героя як супярэчлівую камунікатыўную асобу. Пры гэтым Міхал ніколі не трымае ўсё ў сабе, а наадварот, заўсёды выказвае тое, што думае. Гэта сведчыць пра адкрытасць Міхала, прамалінейнасць.

Аналіз мовы паэмы “Новая зямля” выразна паказаў, што творы Якуба Коласа – ўзор высокага слоўна-выяўленчага майстэрства, а слоўнікавае багацце класіка беларускай літаратуры – скарбніца для вывучэння і даследавання ў розных аспектах.

1. Карасик, В.И. Характеристики педагогического дискурса / В.И. Карасик // Языковая личность: аспекты лингвистики и лингводидактики. – Волгоград : Перемена, 1999. – С. 3 – 17.
2. Колас, Я. Новая зямля / Якуб Колас. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 333 с.

## МОЎНЫЯ СРОДКІ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ БЕЛАРУСАЎ У МОВЕ СУЧАСНЫХ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ

***Шылец К.С.,***
*студэнтка ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Дзядова А.С.,** канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Культура, лексічная адзінка, моўныя сродкі, нацыянальна-культурны, нацыянальны характар.
Keywords. Culture, lexical unit, linguistic means, national-cultural, national character.

Мова з’яўляецца адным з найважнейшых фактараў развіцця культуры, яе багатым скарбам і адначасова складнікам, які атрымліваецца ў спадчыну ад продкаў і дапамагае захоўваць нацыянальна-культурныя каштоўнасці, назапашаныя тым ці іншым народам на працягу стагоддзяў.

Адным з аспектаў сучасных лінгвістычных даследаванняў з’яўляецца праблема ўзаемадзеяння мовы і культуры, у тым ліку адметнасці адлюстравання духоўнага свету народа праз сістэму моўных сродкаў. Актуальнасць нашага навуковага даследавання абумоўлена павышанай увагай сучасных мовазнаўцаў да вывучэння спецыфікі мовы рэгіёнаў з пункту гледжання этналінгвістыкі, сацыялінгвістыкі і лінгвакраіназнаўства. Гэта тлумачыцца тым, што ў айчыннай лінгвістыцы на сённяшні дзень недастаткова распрацаваным застаецца нацыянальна-культурны і сімвалічны аспект функцыянавання беларускай мовы ў рэгіянальным соцыуме. Мэта артыкула – вызначыць асаблівасці рэпрэзентацыі нацыянальных рыс характару беларусаў у мове сучасных перыядычных выданняў Віцебшчыны.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праведзена на матэрыяле наступных раённых газет Віцебшчыны : “Патрыёт” (Ушацкі раён), “Гарадоцкі веснік” (Гарадоцкі раён), “Голас Расоншчыны” (Расонскі раён). Выкарыстаны наступныя метады: апісальна-класіфікацыйны, а таксама метады сістэмнага аналізу, навуковага назірання, лінгвістычнага даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Як адзначае Ю.М. Бабіч, “сродкі масавай інфармацыі па-ранейшаму адыгрываюць істотную ролю ў жыцці грамадства. Нягледзячы на імклівае развіццё інтэрнэт-камунікацыі, друкаваныя перыядычныя выданні пакуль застаюцца папулярнымі і запатрабаванымі” [1, с. 317]. У апошнія гады ў перыядычных выданнях Віцебшчыны сустракаецца шмат публікацый, аўтары якіх выяўляюць цікавасць да тых ці іншых праяў духоўнай культуры і менталітэту нашага народа.

Паняцце “нацыянальны характар” з’яўляецца блізкім да паняццяў “менталітэт” і “ментальнасць”. На думку праф. В.А. Маславай, “нацыянальны характар – катэгорыя, якая

адлюстроўвае знешнюю, "энергійную" форму цэласнага праяўлення ментальнасці, стэрэатыпы паводзін, псіхалагічныя схільнасці, эмацыянальна-валявыя рэакцыі народа [2, с. 36].

З пункту гледжання даследчыцы К.С. Півавар, "на адметнасці характару ўплываюць як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя фактары. Нацыянальны характар (шырэй – нацыянальную псіхалогію) можна коратка вызначыць як своеасаблівую сукупнасць розных псіхалагічных рыс і якасцей, уласцівых для большасці прадстаўнікоў этнічнай супольнасці. Асаблівасці нацыянальнага характару прама ці ўскосна адлюстроўваюцца ў найбольш распаўсюджаных рысах паводзін, пачуццяў і перажываннях большай часткі людзей, якія адносяцца да аднаго народа" [3, с. 6-7].

Як сведчыць даследаваны матэрыял, на старонках раённых газет Віцебшчыны апублікавана вялікая колькасць разнастайных матэрыялаў, праз мову якіх рэпрэзентуюцца нацыянальныя рысы характару беларусаў. Даследаваныя намі моўныя сродкі ў залежнасці ад іх значэння можна падзяліць на некалькі груп, якія семантызуюць наступныя нацыянальныя рысы характару нашага народа:

1. Працавітасць (61 моўная адзінка). Напрыклад, **добрасумленная праца**: *"Мы аддзячылі работнікам міліцыі за іх добрасумленную працу"* ("Патрыёт", 9 студзеня 2021 г., № 2); **плённая праца**: *"Пасля слова меў настаяцель храма Анастасіі Вызваліцельніцы іераманах Ціхан, які благаславіў на плённую працу аграрыяў і сельскагаспадарчую тэхніку"* ("Гарадоцкі веснік", 16 красавіка 2021 г., № 29); **лепшыя працаўнікі**: *"На Віцебшчыне ў лютым па традыцыі ўшаноўваюць лепшых працаўнікоў Прыдзвінскага краю"* ("Патрыёт", 24 лютага 2021 г., № 15); **майстрыха** 'жанчына-спецыяліст у якім-небудзь рамястве': *"Але "фішкай" майстрыхі сталі "кававыя цацкі" – гэта фігуркі з паркалю з кранальнымі і вясёлымі надпісамі"* ("Патрыёт", 9 студзеня 2021 г., № 2); **рука́сты** 'ўмелы, здатны да працы, энергічны': *"Кожны ў Белым абавязкова падкрэсліць, што без дапамогі Валодзі Дзямешкі не абыходзяцца ні на адным падворку: не па службовых абавязках, а проста безадказны, рука́сты, ды іх сям'я самая маладая на вёсцы"* ("Патрыёт", 23 студзеня 2021 г., № 6); **кроўна заробленае** 'заробленае дзякуючы цяжкай карпатлівай працы': *"Вось толькі кракадзіл – не той, у каго няма банкаўскай карткі, а той, хто ўсімі праўдамі і няпраўдамі спрабуе вывудзіць кроўна заробленае з нашых кашалькоў"* ("Патрыёт", 3 лютага 2021 г., № 9**)**; **з душо́й** 'пра таго, хто працуе шчыра, сумленна': *"Творча і з душо́й"* [загаловак] ("Патрыёт", 17 лютага 2021 г., № 13) і інш.

Працавітасць як нацыянальная рыса характару беларусаў рэпрэзентуецца таксама праз народныя прыкметы, прыказкі і прымаўкі. Напрыклад: *"Пачалі жабы947 крактаць – выхадзі на поле, жаўрук зазвінеў – бяры саху ў рукі"* ("Гарадоцкі веснік", 2 красавіка 2021 г., № 25); *"Нездарма кажуць, што вясенні дзень год корміць"* ("Гарадоцкі веснік", 16 красавіка 2021 г., № 29).

Спецыфіку сялянскай працы беларуса-земляроба семантызуюць словы, якія ўваходзяць у разрад безэквівалентнай лексікі, не маючы аналагаў (аднаслоўных адпаведнікаў) у іншых мовах. Гэта нацыянальна афарбаваныя словы тыпу **засе́ўкі** 'пачатак сяўбы', **зажы́нкі** 'пачатак жніва; святкаванне пачатку жніва': *"Засе́ўкі – гэта першы крок на шляху да Зажы́нак, і як вынік усяму – багатага ўраджаю"* ("Гарадоцкі веснік", 16 красавіка 2021 г., № 29).

2. Сямейнасць (41 моўная адзінка). Сямейнасць як сямейны спосаб жыцця беларусаў рэпрэзентуецца назоўнікам **сям'я** і словазлучэннямі **сямейнае шчасце, згода ў сем'ях**:*"І ад усёй нашай сям'і хачу выказаць вялікую падзяку аўтарам гэтага чарадзейства"; "Моцнага вам здароўя і сяме́йнага шча́сця!"* ("Патрыёт", 6 студзеня 2021 г., № 1); *"Моцнага вам здароўя, шчасця, поспехаў у справах, дабрабыту, выгоды і згоды ў сем'ях і з усімі добрымі людзьмі!"* ("Гарадоцкі веснік", 5 студзеня 2021 г., № 1); **мацярынства**: *"Увага – моладзі, падтрымка – **мацярынству**"* ("Патрыёт", 6 лютага 2021 г., № 10); **семейный очаг** (на рускай мове): *"Семейный очаг"* [рубрыка] ("Гарадоцкі веснік", 5 лютага 2021 г., № 9).

Імкненне беларусаў стварыць і захаваць моцную сям'ю, жыць у міры і згодзе з сямейнікамі семантызуецца таксама з дапамогай такіх устойлівых выразаў, як **пражыць душа ў душу, крочыць разам па жыцці**: *"Не кожнай пары ўдаецца пражыць душа ў душу пару дзясяткаў гадоў. А вось Ганна Міхайлаўна і Уладзімір Пятровіч Клопавы з вёскі Жары ўжо больш за паўвека крочаць разам па жыцці"* ("Патрыёт", 9 студзеня 2021 г., № 2).

3. Гасціннасць (3 моўныя адзінкі).

У мове прааналізаваных публікацый, змешчаных на старонках раённых газет Віцебшчыны, гасціннасць як адна з вызначальных рыс беларускага нацыянальнага характару выяўляецца ў семантыцы назоўнікаў **госці, гаспадыня, гаспадар**. Напрыклад: *"Каляды ў "Рыбаковай хаце" праводзяцца з розным складам гасцей ужо трэці год"; дастатак прадракалі гаспадарам калядоўшчыкі"* ("Патрыёт", 16 студзеня 2021 г., № 4).

4. Іншыя станоўчыя рысы характару беларусаў (33 моўныя адзінкі).

Шмат розных станоўчых якасцей характару нашага народа рэпрэзентавана ў мове рэгіянальных перыядычных выданняў Віцебшчыны. Напрыклад, **адказнасць, сціпласць**: *"Адказнасць – наш арыенцір" "Сціплая мара – зімняя куртачка"* [загаловак] ("Патрыёт", 6 студзеня 2021 г., № 1); **шчодрасць**: *"Цеплыня шчодрай душы"* [загаловак] ("Патрыёт", 30 студзеня 2021 г., № 8); **ветлівасць, цярплівасць**: *"На тым провадзе гутарылі доўга, ве́тліва і цярпліва"* ("Патрыёт", 3 лютага 2021 г., № 9); **адкрытасць, руплівасць**: *"Марына Анатольеўна Званкова – чалавек з іскрынкай у вачах, добрай душой і адкрытым сэрцам"; "Руплівасць прыносіла плён"* ("Патрыёт", 10 лютага 2021 г., № 11); **сумленнасць, мужнасць**: *"15 лютага – гэта не толькі дзень памяці загінуўшых, але і выказванне глыбокай павагі і падзякі ўсім тым, хто сумленна і мужна выканаў свой воінскі і грамадзянскі абавязак"* ("Патрыёт", 13 лютага 2021 г., № 12); **белорусская душа** (на рускай мове): *"Не случайно Александр Александрович называет себя русским человеком с белорусской душой"* ("Голас Расоншчыны", 3 красавіка 2021 г., № 13); **патрыятызм**: *"Не губляйце свае карані"* [палосная рубрыка]; *"Да родных каранёў"* [рубрыка] ("Патрыёт", 16 студзеня 2021г., № 4); *"Вучым ро́дную мо́ву"* [загаловак]; *"Цікава праходзіць тыдзень беларускай мовы ў дзіцячым садку № 3 г. Гарадка"* ("Гарадоцкі веснік", 19 лютага 2021 г., № 13); *"Паэт трапіў на радзі́му беларускіх класікаў" ("Патрыёт", 6 лютага 2021 г., № 10);* **міралюбівасць**: *"Ад усёй душы жадаем воінам-інтэрнацыяналістам ... вечна мірнага неба над Беларуссю"* ("Патрыёт", 13 лютага 2021 г., № 12); **жаласлівасць, неабыякавасць да жывёл і птушак**: *"Дарэчы, 16-17 студзеня грамадская арганізацыя "Ахова птушак Ба́цькаўшчыны" праводзіць штогадовую акцыю "Птушкі ля кармушкі" і заклікае прыняць у ёй удзел як мага больш жадаючых"* ("Патрыёт", 16 студзеня 2021 г., № 4) і інш.

**Заключэнне.** Такім чынам, у мове друкаваных рэгіянальных перыядычных выданняў Віцебшчыны фіксуюцца найменні, якія рэпрэзентуюць разнастайныя рысы характару беларусаў, што з'яўляецца сведчаннем спецыфічнай нацыянальнай карціны свету нашага народа, яго светабачання і светапогляду. Намінацыі з нацыянальна-культурным значэннем служаць адным з самых важных сродкаў для перадачы лінгвакраіназнаўчай спецыфікі мовы беларускага народа і найбольш выразна семантызуюць асаблівасці ўспрымання свету носьбітамі беларускай этнакультуры.

1. Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт. III міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14-15 крас. 2016 г.: у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т; пад агул. рэд.: Д.У. Дука, У.А. Лобача, А.І. Корсак. – Наваполацк, 2016. – Ч. 2. – 392 с.
2. Маслова, В.А. Национальный характер сквозь призму языка: монография / В.А. Маслова. – Витебск : УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2011. – 76 с.
3. Півавар, К.С. Беларуская ментальнасць у моўнай прасторы мастацкага тэксту: манаграфія / К.С. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015. – 155 с.

## ПРАЯВЫ ПОСТМАДЭРНІЗМУ Ў АПАВЯДАННІ М. СТРАЛЬЦОВА "СМАЛЕННЕ ВЕПРУКА"

***Яблакаў М.А.,***
*студэнт ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Русілка В.І.,*** *канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Постмадэрнізм, рысы постмадэрнізму, смерць аўтара, Міхась Стральцоў, постмадэрнізм ў беларускай літаратуры.

Keywords. Postmodernism, features of postmodernism, death of the author, Mikhas Streltsov, postmodernism in belarusian literature.